МАГІЛЁЎСКАЯ ВОБЛАСЦЬ (HTTPS://BAJ.BY/BE/GEO/15) 1646

Магілёўскіх журналістаў зноў будуць судзіць

16.03.2020 Крыніца: Служба маніторынгу ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" Сюжэт: 23.5 КаАП (https://baj.by/be/content/235-kaap)

Магілёўскіх журналістаў-фрылансераў Аліну Скрабунову і Аляксандра Сідарэўскага зноў будуць судзіць за парушэнне Закона “Аб СМІ” згодна ч. 2 арт. 22.9 КаАП РБ. Гэтым разам адміністрацыйныя справы журналістаў будзе разглядаць суд Ленінскага раёна Магілёва.



Пратаколы аб адміністрацыйных правапарушэннях былі складзеныя 13 сакавіка ў Ленінскім РАУС, куды журналістаў выклікалі (https://baj.by/be/content/u-magilyove-zhurnalista-zatrymali-lya-ulasnaga-doma-zavezli-u-milicyyu-i-sklali-pratakol) позвамі. Пратакол на Аліну Скрабунову склаў выконваючы абавязкі намесніка начальніка ААПП Ленінскага РАУС маёр міліцыі Дзмітрый Гоманаў (Дмитрий Гомонов) на Аляксандра Сідарэўскага — старшы інспектар ІСН (інспекцыя па справах непаўнагадовых) Ленінскага РАУС маёр міліцыі Васіль Карняенка (Василий Корнеенко).

Міліцыянты ўручылі журналістам позвы з патрабаваннем з’явіцца ў суд Ленінскага раёна Магілёва 19 сакавіка.

І Скрабуновай, і Сідарэўскаму ў віну ставіцца тое, што нібыта ўдзельнічалі “ў незаконным вырабе прадукцыі сродкаў масавай інфармацыі” без акрэдытацыі, калі 20 лютага здымалі сюжэт пра суд над грамадскім актывістам з Магілёва Станіславам Паўлінковічам. Сідарэўскі рабіў

відэазапіс, а Скрабунова брала інтэрв’ю ў грамадзян. Увечары таго ж дня відэасюжэт пад назвай “Суды над абаронцамі незалежнасці ў Беларусі” быў паказаны на тэлеканале “Белсат”.

Магілёўскі праваабаронца Барыс Бухель выказаў меркаванне, што адміністрацыйныя справы журналістаў могуць быць разгледжаныя і ў іншы дзень, бо менавіта суд, а не супрацоўнікі міліцыі, мусіць прызначаць дату разгляду справы. Таксама праваабаронца адзначыў, што ён збіраецца выступіць у судзе ў якасці сведкі, бо прысутнічаў падчас здымкаў сюжэта пасля суда над Паўлінковічам.

У пратаколах аб адміністрацыйных правапарушэннях Скрабуновай і Сідарэўскага сведкамі пазначаны супрацоўнікі міліцыі Вячаслаў Грыц (Вячеслав Гриц) і Павел Башарымаў (Павел Башаримов).

Скрабунова і Сідарэўскі зусім нядаўна ўжо прыцягваліся да адміністрацыйнай адказнасці Кастрычніцкім райсудом Магілёва паводле ч. 2 арт. 22.9 КаАП. Суд пакараў іх штафамі (https://baj.by/be/content/magilyouskaya-zhurnalistka-atrymala-chargovy-shtraf-na-gety-raz-za-stanouchy-syuzhet-pra)ў памеры 50 і 20 базавых велічынь адпаведна за рэпартаж пра юбілей Магілёўскага тралейбуснага парка. Журналісты абскардзілі рашэнні райсуда ў Магілёўскім абласным судзе.

Самыя важныя навіны і матэрыялы ў нашым Тэлеграм-канале — падпісвайцеся! (https://t.me/bajby)

Падпішыся на нашу інфармацыйную рассылку!

Кожны тыдзень атрымлівай на сваю пошту: магчымасці (гранты, вакансіі, конкурсы, стыпендыі), анонсы івэнтаў (лекцыі, дыскусіі, прэзентацыі, прэс-канферэнцыі) і карысны кантэнт.

(https://baj.by/be/node/33)

Найбольш чытанае

Коллеги в тюрьмах. Напишите им письмо поддержки АКТУАЛЬНЫЕ АДРЕСА (https://baj.by/be/content/kollegi-v-tyurmah-napishite-im-pismo-podderzhki-aktualnye-adresa)

«Нават не пытайцеся, як яны будуць збіраць гэты тэтрыс». Як праходзіць суд над журналістам Паўлам Мажэйкам (https://baj.by/be/content/navat-ne-pytaycesya-yak-yany-buduc-zbirac-gety-tetrys-yak-prahodzic-sud-nad-zhurnalistam)

«Белтэлерадыёкампанія» збіраецца паказаць матч еўракубкаў нягледзячы на санкцыі (https://baj.by/be/content/belteleradyyokampaniya-zbiraecca-pakazac-match-eurakubkau-nyagledzyachy-na-sankcyi)

«Падпісчыца пісала ліст Лукашэнку». Як беларускія незалежныя выданні працуюць з рассылкамі (https://baj.by/be/analytics/padpischyca-pisala-list-lukashenku-yak-belaruskiya-nezalezhnyya-vydanni-pracuyuc-z)

Сюжэты (https://baj.by/stories)

COVID-19 (https://baj.by/be/content/covid-19)

23.5 КаАП (https://baj.by/be/content/235-kaap)

Аўтарскія калонкі (https://baj.by/blogs)

Анна Ефременко: белорусского языка в моей жизни за пределами стерильных рамок уроков

Рэгуляванне Байнэту (https://baj.by/be/content/regulyavanne-baynetu-0)

Распаўсюд СМІ (https://baj.by/be/content/raspausyud-smi)

не было вовсе (https://baj.by/be/content/anna-efremenko-belorusskogo-yazyka-v-moey-zhizni-za-predelami-sterilnyh-ramok-urokov-ne-bylo)

Спецпраекты (https://baj.by/analytics/27)



(https://baj.by/be/analytics/bajnaja-persona-tatsyana-melnichuk)

Таццяна Мельнічук: “Танк павінен быў праехаць па акопе, дзе сядзяць салдаты, і я туды спусцілася” (https://baj.by/be/analytics/bajnaja-persona-tatsyana-melnichuk)

Важнае



(https://baj.by/be/analytics/shto-matyvue-udzelnichac-u-bazhnym-zhycci-infagrafika)

Што матывуе ўдзельнічаць у “БАЖным” жыцці? (Інфаграфіка) (https://baj.by/be/analytics/shto-matyvue-udzelnichac-u-bazhnym-zhycci-infagrafika)



(https://baj.by/be/content/freedom-house-belarus-u-

dzyasyatcy-naygorshyh-krain-pa-svabodze-slova)

Freedom House: Беларусь – у дзясятцы найгоршых краін па свабодзе слова (https://baj.by/be/content/freedom-house-belarus-u-dzyasyatcy-naygorshyh-krain-pa-svabodze-slova)



(https://baj.by/be/analytics/zakratavany-yubiley-pra-gonar-byc-syabram-i-kalegam-andreya-alyaksandrava)

Закратаваны юбілей. Пра гонар быць сябрам і калегам Андрэя Аляксандрава (https://baj.by/be/analytics/zakratavany-yubiley-pra-gonar-byc-syabram-i-kalegam-andreya-alyaksandrava)

*Беларуская асацыяцыя журналістаў

Copyright © 2008-2023 Беларуская асацыяцыя журналістаў

e-mail: press@baj.by (mailto:press@baj.by)
Рэдакцыйная палітыка сайта (https://baj.by/be/editorial_policy)

